Передвижения же на дальние расстояния зимою можно совершать в этих краях исключительно только на собаках, при чем в особые, небольшие и легкие сани, называемые нартами, с широкими полозьями, обычно запрягают не менее 10 собак, иногда же и больше (до 20), в зависимости от груза, менее же 8 собак не отправляют в дальнюю дорогу.

Вся запряжка собак не сложна. От нарты тянется основной ремень, от него же отходят боковые ремни для каждой собаки, по одному с каждой стороны основного ремня. Эти боковые ремни прикрепляются к хомуту собаки, проходя под передней ногой. Таким образом, собака тянет, как-бы, одним боком, поэтому каюр (кучер), проехавши некоторое время, останавливается и перепрягает собак одну на место другой, чтобы отдохнула одна сторона.

Первой, т.-е. передовой запрягается *самая умная и самая ценная собака*, которая не только знает, но и хорошо отыскивает путь, кроме того, она понимает все приказания каюра и с нею последний все время разговаривает.

У каюра нет никаких поводьев и он правит почти исключительно при помощи разговора с собаками вообще, главное же с передовой собакой, подбадривая и уговаривая ее.

Собака должна знать язык каюра, при чем в Камчатской области и в Калымском крае чаще всего каюр, кто бы он не был, управляет собаками на русском языке с некоторыми чисто условными словами, напр., вместо—налево говорят **хр-хр** или **ху-ху**. Другие же слова, которыми подбадриваются собаки, чисто русские, напр. „ворона, заяц, куропатка" и т. д.

Кроме разговора, каюр управляет собаками при помощи особой длинной палки с особым острым наконечником (остов). Этот остов прежде всего служит для остановки нарты, для чего каюр вкалывает глубоко в снег между полозьями нарты, остов, который играет роль тормоза и при спусках с гор. Вообще же каюру масса работы в дороге. Он всю дорогу занят, волнуется, вскакивает, бежит, поддерживает нарту, поправляет запряжку и наконец „учит" собак.

Если каюр замечает, что та или другая собака плохо везет, лукавит, то он вбивает остов в снег, т.-е. останавливает нарту, и начинает учить лукавых собак. При чем характерно, собака, предназначенная к порке, сама покорно ложится, как бы готовая принять заслуженное наказание.

Вообще езда на собаках заманчива только в начале дороги, когда собаки дружно подхватят нарту и мчатся во всю мочь. Но и в этот момент надо следить за тем, чтобы не вываливться с нарты на раскате или повороте, так как собаки, почувствовав облегчение, бросятся бежать еще шибче и далеко убегут от упавшего пассажира, раньше чем каюр остановит нарту. Но стоит от'ехать несколько верст, как начинается замедление движения. Прежде всего каждая из 10—16 собак останавливается, чтобы освободить свой кишечник, при чем это делается поочередно, а не сразу. Потом часа через 2—3 собаки устанут и, оглядываясь поминутно, на каюра, высуня язык, начинают все медленнее двигаться. Каюр, устав от подбадривания, начинает „учить" собак, но и это не помогает, тогда, проехав верст 25—30, необходимо дать отдых собакам и подкормить их.

Запряжка собак в 10 штук, обыкновенно везет в дальнюю дорогу 10—12 пудов. Следовательно, на одной нарте могут поместиться только два закутанных в мех человека с небольшою кладью, но, конечно, все зависит от дороги. По хорошей дороге, когда, как говорят на Камчатке „катко", 10 собак могут везти и 15 пуд., но не более при дальней дороге.

Вообще же в дальнюю дорогу редко отправляется одна нарта, большею частью стараются дождаться другой нарты, кроме же того, при дальней дороге необходима еще одна нарта с кормом для собак, состоящим почти всегда из мороженой рыбы сельдятки. В день при хорошей дороге и сносной погоде можно проехать верст 80, но далеко не всегда.

Но езда на собаках во время пурги становится пыткой. Пурга (вьюга) заметает дорогу, собаки начинают двигаться все медленнее, погружаясь в мягкий снег, наконец, ложатся и уже ничто не заставит их итти. Приходится останавливаться и ждать погоды среди безграничной снежной пелены. Иногда такая остановка тянется более суток и путнику приходится устраивать ночлег кое-как у опрокинутой нарты и еще хорошо, если у путешественников есть палатка. При этом все собаки жмутся к путнику и окружают его. Иногда же из чувства самосохранения приходится отдать собакам всю заготовленную пищу. Пильмени, пирожки, котлеты попадают в желудок собакам, потому что самое важное накормить собак, чтобы можно было далее двигаться.

Не менее трудна дорога и после пурги по рыхлому снегу. Собаки тонут в нем и часто каюру приходится впереди прокладывать путь на лыжах, чтобы собаки могли двинуться далее. В таком положении путники иногда делают в сутки не более 10, даже менее верст. Вообще много можно было бы рассказать о езде на собаках, но это не входит в нашу задачу.

На прилагаемом рисунке (I) мы видим нарту собак у опушки леса в Канаде, запряжка их несколько иная—канадская, а не сибирская, но картина того, как тонут собаки в рыхлом снегу, весьма яркая и показательная.

На рисунке 2 мы видим прекрасный образец северной эскимоской собаки, сильной со стоячими ушами с пушистым хвостом и с грубой теплой шерстью.

Таковы же собаки и на всем севере Сибири. Их совершенно неправильно называют лайками. Только по морде они несколько напоминают лайку, больше же они напоминают северного волка и чем дальше на север, тем отчетливее выступает тип волкообразной собаки, которую лучше всего назвать *полярной собакой*. Самое характерное у полярной собаки это ее волчьи свойства: выносливость, неутомимость, некоторая свирепость и дикость.

Лучшие ездовые собаки считаются калымские, эти собаки славятся по всему северу и составляют гордость владельца.

Каждый калымчанин знаток, любитель и своеобразный спортсмен полярной ездовой собаки. Эти свойства калымской собаки находятся в большой зависимости с тем, что на Калыме внимательно воспитывают молодых собак, их хорошо кормят, выдерживают и запрягают только тогда, когда собака достигает полного развития,

На Калыме никогда не ездят на самках, тогда как и в других краях такая езда распространена.

Установлено, что лучшими по выносливости ездовыми собаками являются метисы собаки и волка, что нередко наблюдается на севере. То сука убежит в охоте с волками и возвращается уже оплодотворенной, то калымчане приручают волчат и от них имеют потомство. Напомню, что об этом же нередко писал в своих очаровательных рассказах Джек Лондон—„Из жизни золотоискателей на Аляске".


Часто пишут, что полярные собаки не лают, а только воют. Это верно, но только относительно. Упряжная собака, которая большую часть жизни проводит на коротком приколе, часто несет свою трудную работу, действительно, разучается лаять, но щенки лают и взрослая полярная собака начинает лаять, попадая в иные условия жизни. Все другие собаки, случайно попавшие в запряжку, также скоро перестают лаять, к какой-бы породе они не относились.

Но вой полярной ездовой собаки действительно производит тяжелое впечатление.

На далеком Чукотском полуострове, на знаменитой Анюйской ярмарке, куда собирается несколько тысяч упряжных собак (до 3000), иногда по ночам слышится вой всей этой массы собак. Этот вой производит подавляющее, ужасающее впечатление на европейца. Стоит только в глухую ночь завыть одной собаке, как начинают выть сотни...

Как видите, мы в своей статье коснулись жизни собак в таких условиях, какие нам кажутся почти непонятными.

Но там в полярных странах только собака помогает человеку бороться с исключительными условиями жизни, к которым приспособился и человек и собака. Без собаки сама жизнь в этих приполярных странах была бы невозможной. Если читатели заинтересуются этой статьей, я могу еще много интересного рассказать о полярной собаке, как ездовой, так и охотничьей.



Стайка т. Барташа (Витебского округа)



М. Гэдыцкі-Гьвірко.

На закопах.

Аднойчы, у жніўні месяцы, Апанас зьбіраўся на „Ліпавую граду“ на ласёў. Я папрасіўся з ім пайсьці. Апанас перш не згаджаўся, а пасьля сказаў:

— Хоць ты мне і не паможаш, але ўжо вазьму. Толькі стрэльбу дастань.

Радасьці маёй ня было канца. Зьбегаў да канцавога Янкі і пазычыў пістаноўку. Апанас таксама, звыклаю рукою закінуў на плячо сваю—ушнураваную дротам і зьбітую бляшкамі—гарлатую пістаноўку, і мы пайшлі.

Нас агарнула ціхая жнівеньская ноч. Каля шчок лашчылася пахучая, цёплая вільгаць лугоў, а пад нагамі шаргацела трава. Ноч маўчала. Маўчалі і адпачывалі недзе і ласі, каб днём вярнуцца зноў у закопы (ямы, разбушаваныя ласямі ў час ганьбы).

Паволі пасоўваючыся, пад дзень, мы апыніліся на месцы.

Досыць вялікая, паросшая мешаным лесам, Ліпавая града шырока разьляглася сярод балотаў. На адным яе канцы была невялічкая палянка, дзе з даўных-даўно любілі ласі рабіць свае спатканьні. Парасьнік там ня мог расьці, бо кожны год ён вываручваўся капытамі і рагамі гэтае разбушаванае жывёлы.

Абраўшы мясьцінку, паросшую ельнікам, мы схаваліся. Апанас нешта доўга кешкаўся на сваім месцы і паразбуджваў глушцоў, што драмалі на асіньніку.

Загараўся золак. Навокал ціха. Недзе далёка адазваўся толькі воўк.

— Будзем вабіць,—сказаў Апанас.

Глухое „У-о-о-о“ пракацілася па заспакоеным лесе і замерла. Чакаем. Апанас завабіў зноў.

— Адзываецца,—прашаптаў Апанас.

Сапраўды, вельмі падобны здалёку на квахтаньне жабы, ласіны голас хутка блізіўся. Неўзабаве пачуўся трэск і хрускат сукоў ад капытоў.

Раптам раскінуўся густы лазовы куст і з-за яго, як з варот, на палянку выскачыў вялізарны лось.

Апанас не страляў. Я таксама не адважваўся парушаць гэтую напружаную цішыню. Мы любаваліся ім абодвы. А ён высока падняў сваю рагатую галаву і таксама як-бы разглядаў нешта, ці можа нюхаў. Раптам—ён круцянуўся і зьнік.

Апанас стукнуў шапкаю обзем і сплюнуў.

— Чорт!—вылаяўся ён. Яму было шкода лася, а я радаваўся, што ён незачэплены ўцёк ад нас.

Паднялося сонца і абліло сьветлымі касьнікамі ельнік. Мы ціха сядзелі і чагосьці чакалі яшчэ. Неўзабаве зноў пачуўся хрускат. Памалу ён набліжаўся, а пасьля—прываблевая намі і ласёвым галасам—выйшла ласіха з ласянём. Апанас то прыцэльваўся, то апускаў стрэльбу. Відаць, ім панавала нейкая нерашучасьць. Пасьля перамагло паляўнічае чуцьцё і Апанас выстраліў. Ласіха, неяк нехаця, брыкнула на зямлю.

Куля прайшла каля лапатак навылет, не зачапіўшы вантробаў, і ласіха ляжала, як жывая. Яна то падымала, то апускала галаву і ня зводзіла воч з свайго дзіцяці. Прасіла, здавалася, каб не чапалі яго, маліла апошнім мяккім поглядам і сьлязамі.

Апанас нацэліўся і на ласянё. Я пачаў прасіць, каб ён не чапаў. Апанас даводзіў, што яго ўсёроўна задушаць ваўкі, але пасьля—глянуўшы на гэтыя ласкавыя сьлязівыя вочы ласіхі—пакінуў.

Пасьля ласіха страпянулася і заціхла.

— Гатова,—сказаў Апанас з уласьцівай паляўнічаму спакойнасьцю.

Ліпава града маўчала бязьлюдзьдзем.


Сяргей Фамін.

Па першай парошы.

Як добра сягоньня, прыгожа,
Як радасна бліскае сьнег.
Сягоньня па першай парошы
І першыя скрыпы саней.
Сягоньня па полі мой вылаз,
Сягоньня—душою гарэць!
...Зайцы ў нашым садзе пагрызьлі
Шмат маладзенькіх дрэў.
Я ў поле гатоў. За плячыма
Знаёмая стрэльба і хлеб.
Іду я. І пахне дымам
Так смачна у нас на сяле.
Я ў полі. Чарнеюць кустамі
На дальніх палёх раўчакі.

І чутна мне: дзесь за гаямі
Ганяюць зайцоў ганчакі.
Тут кожны мне кусьцік знаёмы
І кожны знаёмы мне пень.
Ня чутна ў нагах утомы
У такі жыцьцярадасны дзень.
Здароў! і маё шанаваньне.
— Здароў! даражэнькі Андрэй!
— Сягоньня-ж паляваньне!
Глядзі, як лісіцу ўгрэў!
А зьвезшы ў саюз у горад
Дадуць там чырвонцы з два!
...Ад зайздрасьці ў гэтых прасторах
Круцілася нават галава.

Гарэла рука ў нагавіцах.
Сабака віляў хвастом.
... Цяпер-бы такую лісіцу
Забіць пад каравым кустом!
. . . .
Дзень цэлы хадзіў—ні вароны
Нідзе, як на зло, не забіў.
У вечары позна, сцюдзёна
З сувеямі вецер завыў.
Вярнуўся, з Андрэем зыйшліся.
І доўга сьмяяўся Андрэй.
Зайцы ў нашым садзе пагрызьлі
Шмат маладзенькіх дрэў.



Паляўнічая стрэльба Ўл. Іл. Леніна.—Падарунак раб. і служ. 1-х тульскіх аруж. заводаў—15 красавіка 1923 г. (музэй Інстытуту Леніна).

Ян. Скрыган.

Запаведнік імя Ўл. Іл. Леніна.

КАЛЯ трыццаці гадоў таму назад у Сібір—у сяло Шушэнскае, Мінусінскае акругі—прыслалі яшчэ аднаго палітычна небясьпечнага чалавека. Гэты чалавек быў з вялікім лбом, выразнымі рысамі, дабрадушны, спакойны, але бунтар. Яго саслалі ў гэты супяшчаны і суглінкавы край, з шырокімі балотамі і імшалымі лясамі, каб у іх ён глушыў сваю—яшчэ шырэйшую—натуру бунтара. Яму забаранілі бачыцца з людзьмі — не адлучацца з Шушэнскага. Забаранілі быць поўнапраўным чалавекам і хацелі — забараніць думаць, каб не тварыць. Алегэты чалавек быў стойкі, як само жыцьцё. І гэты чалавек быў—Ленін.

... Коммунизм есть советская власть плюс электрофикация всей страны, ибо без электрофикации поднять промышленность невозможно.

ЛЕНИН.

Ён пасяліўся ў шушэнца—Зыранава Апалона. Сібір—далёкі край. Шырока раскідаліся прасторы, шумелі лясы, лютавалі зімы і прабягалі дні. Тады, у гэтых неабдымных прасьцягах яму рабілася цесна, бо для яго—яны былі забаронены. Давалася магчымасьць мець іх столькі, колькі мог-бы чалавек абыйсьці за дзень і вярнуцца назад, каб не палічылі ўцёкшым. У Мінусінск можна было езьдзіць з дазволам паліцыі або тайком. Выручалі кнігі. Зыранаў кажа так:

„Уладзімер Ільліч вёў уседлівае жыцьцё за кнігамі. Толькі вясною Уладзімер Ільліч пачаў знаёміцца з мясцовасьцю. Ён сумаваў па Крупскай, бо яе меліся саслаць у Туруханскі край, а хадайніцтва Уладзімера Ільліча аб перамене месца засталося бяз увагі“.

І вось у гэты час Зыранаў запрасіў Уладзімера Ільліча паехаць з ім у поле. Там можна было крыху адпачнуць, разагнаць сум—са стрэльбаю. У апросным лісьце над Зыранавым у 1927 г. запісана:

„Сумны Уладзімер Ільліч, пахадзіўшы некалькі дзён са стрэльбаю, стаў весялейшым; ён нават моцна сьмяяўся з просьценькае Зыранавае стрэльбы, кажучы, што з яе небясьпечна страляць, але ўсё-ж страляў. З Зыранаваю стрэльбаю Уладзімер Ільліч хадзіў, пакуль ня купіў сабе драбавіка-бэрданкі“.

Гэта было першае паляваньне Уладзімера Ільліча. Зыранаў займаўся гаспадаркаю. Паляваньнем яму некалі было займацца. А ў суседа Ермакова Янкі жыў другі ссыльны—Аскар Бэрг. Уладзімер Ільліч часта на ведваў Бэрга, але Бэрг быў пахмурны і на паляваньне хадзіў рэдка. Уладзімер Ільліч пазнаёміўся з Ермаковым, Страганавым і настаўнікам Старадубцавым, з якімі пасьля ён і хадзіў на паляваньне.

„Аблюбаваным месцам было возера Перава з ягонымі балотамі. Хадзіў Уладзімер Ільліч і ў другія месцы, напр., на возера Бутакова, у зарасьнік рэчкі Шушы і азёрка, з якога выцякае рэчка Шыпілаўка“—

успамінае Зыранаў. А ў апросным лісьце над другім спадарожнікам Уладзімера Ільліча па паляваньню—Ермаковым Янкам—запісана:

„Уладзімер Ільліч быў паляўнічым аматарам, але ня палкім; ён не ганяўся за спужанаю дзічынаю, а цярпліва чакаў прылёту другіх ці сам ішоў на другое месца, шукаючы дзічыны. Страляў Ул. Ільліч не падкрадваючыся, не прыгінаючыся, амаль бяз промаху. Калі паляваньне было ўдачна і набівалі многа дзічыны, дык Ул. Ільліч, узяўшы крыху сабе, рэшту аддаваў удзельнікам паляваньня. Езьдзіў Ул. Ільліч больш усяго з Ермаковым. У часе паляваньня Ул. Ільліч быў бадзёры—жартаваў, сьмяяўся. Відаць паляваньне яму падабалася, бо ён мала часу траціў на стаянкі, а наадварот—многа і шпарка хадзіў“.



Адрас ад рабочых і служ. 1-х Тульскіх заводаў „Ул. Іл. Леніну 15 красавіка 1923 г. (музэй Інстытуту Леніна).



М. Вилькобриский.

Как ухаживать за дробовым ружьем.

НЕБРЕЖНОЕ обращение с ружьем приводит к тому, что оно становится неисправным, а потому и непригодным к употреблению и, весьма возможно, что такое ружье, в тяжелую для охотника минуту, может изменить ему. Поэтому нужно внедрить в сознание каждого охотника самые элементарные правила по уходу за дробовым ружьем. Хороший уход за своим ружьем сохранит его на долгий срок

Самый злейший враг ружья—это сырость, поэтому ружье надо всегда хранить в сухом месте, в чехле или ящике, хорошо вычищенным и смазанным.



Отец с дочерью на номере

Нет надобности повторять о том, что ружье должно быть разряженным.

Особенно надо беречь ружье на охоте. Не надо прислонять ружье к дереву или к стенке, ибо ружье может легко упасть и стволы помнутся, что сильно влияет на бой ружья.

При поездке на охоту надо держать ружье в ящике, если же оно собрано, то в вагоне повесить его, а при переезде на телеге обязательно держать в руках, ибо ружье в собранном виде, подвергаясь толчкам, легко расшатывается, а отсюда получается шатание стволов.

Никогда при разборке ружья или сборке не следует употреблять силы. Если та или иная часть не вынимается свободно—это значит, что или эта часть или соседняя не в порядке. Нужно внимательней осмотреть эти части и, если ничего не получается, обратиться лучше к знающему человеку, а в крайнем случае к мастеру, чем самому, применяя силу, сломать или испортить какую-либо часть.

При открывании ружья, никогда не надо давать стволам свободно падать вниз, от этого начинают шататься стволы, расшатывается затвор и, вообще, портится ружье. Нужно всегда стволы поддерживать рукой, а при закрытии стволов не закрывать их резко.

Иногда случается, что гильза туго входит в ствол. Никогда не надо силой их загонять. Это тоже верная порча ружья, ибо расшатывается вся система. Лучше не жалеть и браковать такие гильзы, ибо только туго входящие патроны ломают экстракторы и расшатывают затворы. Чаще всего патрон не входит в патронник из-за разбухания гильзы (бумажная гильза) от сырости или же от большого пыжа, а поэтому на охоте надо беречь патроны от сырости, держа их в патронташе и более внимательно снаряжать патроны.

Чистить ружье нужно не только после стрельбы, но чистить ружье необходимо всякий раз, когда ружье бралось на улицу или-же его осматривало много людей и на ружье остался пот от рук, сырость от воздуха и т. д.

Пот, влажность ствола от воздуха, нагревание дыханием и т. д. могут повлечь за собой появление ржавчины.

В американском наставлении есть такие слова: „Никогда не прицеливаться в кого-нибудь кроме вора, бандита и зверя. Умные люди не любят, чтобы

Быў яшчэ адзін спадарожнік у Ўл. Ільліча—Страганаў Пятрок. Уладзімер Ільліч дзяліў з ім часы—доўгія зьняволеныя тры гады—ходзячы на дупялёў, бакасоў, качак. І Страганаў успамінае:

„На паляваньні Ўл. Ільліч адпачываў мала; ён многа і шпарка хадзіў. Страляў Ул. Ільліч сьпяшаючыся, што іншы раз было прычынаю няўдачы, але гэта не перашкаджала яму цярпліва ісьці далей і шукаць дзічыны ў другіх мясцох... На стаянках, абедаючы ці п'ючы чай, Ул. Ільліч быў прыемным субяседнікам; гутаркі былі жартаўлівага характару.

Так праводзіў час Уладзімер Ільліч у Сібіры на працягу трох год. Яго палюбілі шушэнцы за адзыўчывасьць, дабрату.

5-га чэрвеня 1927 г. сабраліся шушэнцы на сход. Яны абгаворвалі пытаньне, як захаваць памяць Уладзімера Ільліча.

У пратаколе сходу записана:

Слухалі: 3. Аб заснаваньні паляўнічага запаведніка імя Ўл. Іл. Леніна-Ульянава каля сяла Шушэнскага, дзе паляваў Ул. Іл. Ленін (дакл. спэцыяліст па паляваньню пры Акр. Лясным Аддзеле тав. Слабодчыкаў).

Ухвалілі: Заснаваньне паляўнічага запаведніка імя Ўл. Іл. Леніна-Ульянава прызнаць мэтазгодным у лясох мясцовага значэньня ў отрубе № 3, плошчаю ў 418.68 гэктараў (383,22 дзес.) у яго межавых граніцах, з усімі балотамі і возерам Перава, куды больш усяго хадзіў на паляваньне Ул. Ільліч.

Старшыня с/савету **Пашын**.

Сібір—далёкі край. Шырока раскінуліся прасторы, просіньню зьвініць тайга, прабягаюць дні І там, дзе шуміць лес отрубу № 3, стаіць пяць слупоў з надпісамі: **„Паляўнічы запаведнік імя Ўл. Іл Леніна“**

ружье наводилось на них, заряжено оно или нет, все равно—легкомысленный человек является в этом случае угрозой для своих товарищей".

Этот совет тоже необходимо помнить, дабы не быть виновником несчастного случая. Лучше иметь привычку носить ружье так, чтобы оно было всегда дулом кверху, заряжая ружье, всегда следует его держать дулом книзу, не стрелять тогда, когда отчетливо не видать куда стреляешь и не надо долго вести стволы за летящей птицей или бегущим зверем. Это обеспечит нам возможность уменьшить количество „случайностей", кои, по вине некоторых, так часто имеют место.

Теляковский.

Туманное представление.

(Ответ на статью М. Вилькобриского „Вопросы стрелкового спорта" „П. Б." № 6—28 г.).

Хочется выбраться из полосы тумана и яснее представить себе, что именно, предлагает нашему вниманию гр-н Вилькобриский, разрабатывая по материалам Н. М. Филиппова, „Выстрел № 10", стрельбу из дробовиков.



Привожу некоторые места из его „Вопросов стрелкового спорта" (П. Б. № 6—1928 г.).

В начале статьи пишется дословно так: „Прошлые статьи освещали в большинстве своем вопросы стрельбы пулей, между тем, как кроме охотничьих ружей для спортивной стрельбы и для охоты употребляются дробовые ружья".

Но дробовое ружье ведь и есть, именно, охотничье ружье, а о каких охотничьих ружьях, кроме дробовых, для спортивной стрельбы и охоты писал раньше гр-н Вилькобриский, описывая стрельбу из русской трехлинейки, неизвестно.

Охотничьим ружьем принято называть, обыкновенно, гладкоствольный дробовик, употребляющийся для охоты, как по мелкой и крупной птице, так и по зверю.

Для целей охоты служат так-же и специальные охотничьи винтовки и карабины: мелкокалиберные и под более сильные патроны.

Дальше: „Типы дробовиков, в зависимости от различных условий стрельбы, отличаются от охотничьих ружей, но общие положения, конструирования тех и других почти ничем не отличающихся".

„Тут, и до смысла не добраться: „сам чорт ногу сломит". И чем отличаются типы дробовиков от охотничьих ружей, как видно, большая тайна не только для нас, но и для самого гр-на Вилькобриского.

Затем дословно: „Но условия стрельбы сильно диктуют свою волю для резкости и кучности боя дробовика. Например: при охоте на крупную дичь на большое расстояние желательно (и даже необходимо подстрелить ее так, чтобы она осталась на месте (как говорят „бить дичь мертво"). Здесь нужна большая кучность и резкость боя. А при стрельбе на малые расстояния по мелкой дичи, стреляя большой кучностью и резкостью боя, дичь будет разорвана в клочки".

Во-первых, зачем это „подстреливать" дичь, если ее можно „бить мертво?"

Во-вторых, да будет известно гр-ну Вилькобрискому, что обыкновенно крупную дичь—бьют крупной, а мелкую дичь—мелкой дробью.

Так что опасаться того, что при стрельбе на малом расстоянии по мелкой дичи, стреляя с большой кучностью и резкостью боя, дичь будет разорвана в клочки, нечего. Достаточно только взять дробь нужной величины и номера. Дальше: „Увеличение кучности боя спортивного дробовика достигается посредством особой сверловки стволов с сужением у дула, так называемая „чоковая „сверловка".

А дробовику, не „спортивному", а обыкновенному, нашему „охотничьему", по вашему мнению, чок не полагается, так что-ли? Дескать, довольствуйтесь, граждане-охотнички, не спортсмены, одними цилиндрическими стволами, потому, чоки не для вас деланы.

10 заповедей здоровья охотнику зимой.

1. Если идешь на охоту со сна, умойся холодной водой—лицо не обветреет.

2. Если пьешь горячее, подожди 1/2 часа и тогда иди на охоту, иначе можешь простудить горло.

3. Идя на охоту, не ешь соленого, захочешь на охоте пить, будешь есть снег—простудишься.

4. Одеваясь на охоту, больше всего смотри, чтобы ногам было тепло. Сам одевайся полегче, иначе скоро устанешь.

5. Подбегая под зайца—вспотеешь—не стой долго на ветру—старайся быть в движении.

6 Вспотевши не пей холодной воды и много.

7. Вспотевши не расстегивайся, чтобы простыть—тише хода.

8. Если на охоте вспотел, не поезжай домой на лошади, дорогой прозябнешь—простудишься.

9. Если обмерзнут руки или ноги—не лезь сразу на печь, раньше разотри руки или ноги снегом.

10. Водки не пей—скорее замерзнешь.

Д-р Леоренцевич.



Пристрелка

Да ведама падпішчыкаў нашага часопісу.

На адрас усіх райкалектываў Акруговымі Праўленьнямі разасланы для раздачы гадавым падпішчыкам адрыўныя штомесячныя паляўнічыя насьценныя каляндары на 1929 г. Падпішчыкі, якія яшчэ каляндары не атрымалі, могуць атрымаць яго ў бюро райкаляк.пыву.

ПРАЦУ ПАЛЯЎНІЧАЕ КААПЭРАЦЫІ ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ МАС!

Ізноў аб Мазырскіх галавацяпах.

Вы думаеце, т. чытач, што праца ў Мазырскім праўленьні палепшылася? не!..

Мы да гэтага часу думалі, што ва ўсім вінавата былое праўленьне, але-ж зараз пераканаліся ў тым, што і новае не адстае ад старога. Старое праўленьне абвінавачвалі ў тым, што яно не забясьпечвае паляўнічых ні стрэльбамі, ні зарадамі. А новае? новае зусім нічога ў гэтым напрамку ня робіць. Прайшло веснавое паляваньне, пройдзе і зімовае, а шроту і пістонаў усё няма і няма.

Наша хата з краю.

Усю віну акруговае праўленьне ўскладае на цэнтральнае праўленьне.

— Няма стрэльбаў і шроту таму, што цэнтральнае праўленьне нас не забясьпечвае гэтым,—адказваюць працаўнічкі з акруговага праўленьня. А калі аднойчы некалькі стрэльбаў прыслалі, дык іх расхапілі хто па два, а хто і па тры. А калі паляўнічы бядняк хацеў купіць стрэльбу, дык яму акруговая каса ўзаемадапамогі пры акруговым праўленьні ня толькі не дапамагла, дык яшчэ цягнула некалькі месяцаў.

Праўленьне захоплена рыбаю.

У галіне рыбнага промысла нешта робіцца: раніцою, каля крамы, вы кожны дзень знойдзеце амаль што ўсё праўленьне, нават прадавец паляўнічага магазыну, і той прыходзіць дапамагаць. Спэцыяльна для рыбацкіх спраў вылучан платны інструктар, але-ж што ён робіць? аб гэтым гісторыя маўчыць. Мы толькі ведаем адно, што так далей не павінна быць.

Спачываюць на лаўрах.

Аб такой рабоце, як барацьба з драпежнікамі, дык і гаварыць ня прыходзіцца. Ня мала выпадкаў, калі паляваньне на качак зрывала аблаву на ваўкоў. (Аблава ў вёсцы Мялешкавічы, Каралінскага раёну).

Нават калі па ініцыятыве Каралінскага калектыву быў арганізован атрад зьнішчальнікаў, дык і то акруговае праўленьне адмовіла ў прадстаўленьні флажкоў.

Ня лепш і з астатняй працай: ня толькі нічога ня зроблена па перарэгістрацыі ў гэтым годзе, дык нават перарэгістрацыя мінулага году яшчэ ня скончана.

Штат, які ўвесь час адпачывае.

Наконт колькасьці штату праўленьня не пасаромяліся. Штат, „дзякаваць богу", як ва ўсялякім буйным добра працуючым акруговым праўленьні, але-ж гэты штат нічога ня робіць, пэўна ўвесь час адпачывае; білеты ляжаць у праўленьні да таго часу, пакуль ня прыедзем за імі. Есьць ня мала паляўнічых, якія ў Саюзе састаяць па некалькі год, плацяць рэгулярна ўсе ўзносы, а білету і вачыма ня бачылі.

У магазыне яшчэ горш: загадчыка магазыну Шнэйдэра днём „з агнём ня знойдзеш".

Ці не пара, таварышы, каму належыць, узяцца за „ператруску" Мазырскага акруговага праўленьня?

А. Міронаў.

Ад рэдакцыі. Рэдакцыя лічыць неабходным давесьці да ведама нашых чытачоў, што ў забесьпячэньні мазырскіх паляўнічых шротам і стрэльбамі Цэнтральнае Праўленьне не вінавата, а вінавата Мазырскае Акруговае Праўленьне. Апошняя партыя стрэльбаў (лістапад месяц), якая была атрымана Цэнтральным Праўленьнем, яскрава аб гэтым сьведчыць. Напамінаньне аб тым, што ЦБ атрыманы стрэльбы, Мазырскаму Праўленьню не дапамаглі. Усе акругі атрымалі стрэльбы, а Мазыр чамусьці не захацеў.

Каапэратар, для якога законы ня пісаны.

Ніхто ня можа паверыць таму, што *старшыня праўленьня Мілаславіцкага сельска-гаспадарчага таварыства Шэляпенка* ня ведаў закону аб забароне адстрэлу вавёркі з 16 лютага 1928 г. Але, што Шэляпенку да закону. Яму патрэбны загатоўкі, ён увесь „захоплен" каапэрацыйным жарам.

Нясецца Шэляпенка галопам па загатоўкам, забыўшы нават і тое, што ён сам зьяўляецца членам калектыва паляўнічых і сваёй уласнаю рукою руйнуе паляўнічую гаспадарку. За сьпіной Шэляпенкі гудзяць стрэлы браканьерскія і зьнішчаецца каштоўны і рэдкі зьвярок—вавёрка.

Чытаем афіцыйную сводку Мілаславіцкага с./г. Т-ва аб пушных загатоўках і бачым, што на 20 лістапада загатоўлена 15 штук вавёркі. Б'ём трывогу,—просім Акруговае Праўленьне Т-ва Паляўнічых хутка прыняць меры і папераджаем Шэляпенку—спыніць незаконныя загатоўкі. Але ня уймаецца зайздросны каапэратар, наступная сводка загатовак—24 вавёркі. Крычым мацней,—але справа прыстыла. Акруговае Праўленьне не зьвяртае ўвагі, а Шэляпенка і размаўляць ня хочыць. На заўвагу Бюро калектыву паляўнічых Шэляпенка становіцца ў позу Апалона Бельвэдэрскага і заяўляе, „што мне Бюро калектыву, калі будзе патрэбна, мы пагутарым у належным мейсцы". А рукі браканьерскія ня спыняюцца, і ў Міласлаўшчыне загатоўлена 77 штук вавёрак.

Хто-ж нарэшце пачуе крык калектыву паляўнічых Клімаўшчыны? Хто-ж застановіць гэту шкодніцкую работу?

Апошняя сэсія ЦВК СССР паказала на цьвёрдае правядзеньне ў жыцьцё рэвалюцыйнай законнасьці. Мы катэгарычна настайваем—тэрмінова спыніць шкодніцкую работу і беззаконьне Шэляпенкі і стала азнаёміць яго з артыкулам 126 Крым. Кодэксу, каб ён зьявіўся суровым стымулам для Шэляпенкі і яму падобных.

Стасенка.

„Ня кіем, дык палкай“,

ці аб тым, як Лясны Аддзел Наркамзему тлумачыць законы.

Усім як быццам вядома, што паляўнічая каапэрацыя з усёй энэргіяй узялася за аднаўленьне паляўнічай гаспадаркі, што навакол гэтага пытаньня мабілізавана агульна-грамадзкая думка паляўнічай масы, бо ад таго, наколькі мы правільна павядзем гэту працу, залежыць далейшае разьвіцьцё паляўнічай каапэрацыі БССР, залежыць пушны рынак БССР і г. д.

Але-ж інакш на гэтую справу глядзіць Лясны Аддзел НКЗБ, які аднэй рукой падпісвае дырэктывы аб ахове паляўнічай гаспадаркі, а другой рукой санкцыяніруе разбурэньне яе.

У справах Менскага Акруговага Т-ва Паляўнічых мы знаходзім наступную адносіну Ляснога Аддзелу НКЗБ:

У БАРЫСАЎСКІ РАЙВЫКАНКОМ.

Адбітак Каапэрацыйнаму Таварыству Паляўнічых. (Менск).

Наш ув. № 7968.

Далучаючы да гэтага перапіску па хадайніцтву гр-на вёс. Курганаўкі, Барысаўскага раёну, Лятэцкага Антося Міхалёва аб выдачы яму 24 руб. за пашкоджанае дзікам яго жыта, Лясны Аддзел НКЗ просіць РВК абвясьціць т. Лятэцкаму, што для здавальненьня яго хадайніцтва ў Лясным Аддзеле сродкаў няма і, апроч таго, і выплачваць за такія шкоды няма падставы, бо *закон забараняе паляваньне на дзікаў, але гэта ня значыць, што іх нельга ганяць з патравы нават і адстрэлам* (Курсыў наш. *М. Ш.*).

Загад. Лясн. Аддзелу НКЗБ (подпіс).

Інспэктар Эксплёатацыі лясоў (подпіс).

Здаецца, што пасьля гэтакага тлумачэньня закона,—„але гэта ня значыць, што іх нельга ганяць з патравы нават і адстрэлам“, не патрэбен першы закон аб тым, што паляваньне на дзікаў забараняецца.

І нехаця, пасьля гэтага, паўстае пытаньне,—дзе-ж гэты дзік? Ці не знаходзіцца ён у апараце Ляснога Аддзелу НКЗБ? На гэта пытаньне дазваляем адказаць чытачу.

Нам толькі вядома адно, што калі і далей так будуць тлумачыць законы, дык паляўнічую гаспадарку нам так і не аднавіць.

Спадзяемся, што саадпаведныя ўстановы і ў першую чаргу Калегія Наркамзему Беларусі зьвернуць сваю ўвагу на гэтую справу. **М. Ш.**

Аб шырокім размаху і вузкай рабоце.

(Бабруйскае Акруговае Таварыства).

— Нас лаяць ніхто ня будзе,—разважае сабе Бабруйскае Акруговае Праўленьне.

І на самай справе, як можна лаяць, калі пры Акруговым Праўленьні маецца пяць сэкцый. Падумайце вы самі, пяць сэкцый! Але-ж у гэтых сэкцыях наконт працы ня пытайцеся.

Разгледзім кожную ў паасобку: сэкцыя паляўнічае гаспадаркі за ўвесь час склікала адно пашыранае пасяджэньне, склала плян працы, у якім выказала вялікія падзеі аб палепшаньні становішча паляўнічае гаспадаркі шляхам пабудовы заказьнікаў і г. д., але-ж гэтыя падзеі засталіся толькі ў пляне; каапэрацыйная сэкцыя таксама нічога ня робіць; засталіся на пляне і думкі культурнае сэкцыі, ніхто ні разу з Акруговага Праўленьня не зацікавіўся паглядзець, што робіцца ў галіне культурнага абслугоўваньня паляўнічых. Такое-ж становішча і ў стралковай сэкцыі. Крыху лепш абстаіць справа ў сэкцыі кроўнае сабакагадоўлі.

Чым-жа тлумачыцца, што не працуюць сэкцыі? Тлумачыцца гэта тым, што Акруговае Праўленьне ні разу не заслухала справаздачы сэкцый і, наогул, ня цікавіцца працай апошніх. **Паляўнічы.**

Слухалі і пастанавілі.

Важнасьць разгортваньня культурнае работы сярод паляўнічае масы, як відаць, ня ўсе Акруговыя Праўленьні сабе ўявілі.

Куды можа быць горш, калі такая акруга, як *Менск*, якая працуе ў адным памяшканьні з Цэнтральным Праўленьнем Белкахотсаюзу, нічога ў гэтым напрамку не зрабіла. Праўленьне „Менахоты“ абмежавалася толькі тым, што разглядзела абежнік Цэнтральнага Праўленьня аб вядзеньні культурнае работы, пасьля чаго вынесла пастанову: *„даручыць т. Усьцінаву падшукаць двух таварышоў для працы ў культкамісіі пры „Менахоце“, пасьля чаго даручыць гэтым таварышам абвесьціць запіс у гурткі“.*

Пытаньне гэтае разглядалася 30 лістапада, а зараз ужо канчатак студзеня месяца 1929 году, а людзі ўсё „падшукваюцца“.

І, наогул кажучы, ці такую казённую нікчэмную пастанову выносяць аб культурнай рабоце? Ці можна абмежавацца даручэньнем культкамісіі абвесьціць запіс у гурткі? Мабыць Праўленьне мела на ўвазе, што гэтыя таварышы паедуць самі і на вёску запісваць таварышоў у гурткі, тады іншая справа, а паколькі нам вядома, тут маецца на ўвазе запіс гарадзкіх паляўнічых, і толькі, а культурная праца ў раёне як быццам Акруговага Праўленьня не датычыцца.

Ці не пара, таварышы, адмовіцца ад такіх афіцыйных непрактычных пастаноў? **— дт.**

Было-б добра, калі-б...

(Слуцкі раён).

У працы Слуцкага раённага калектыву паляўнічых маюцца некаторыя дасягненьні; так, напрыклад: калектыў налічвае 347 членаў, з якіх 278 падпісалася на часопіс „Паляўнічы Беларусі“; на пабудову самалёту сабрана 273 рублі; аблігацыі Сялянскай Пазыкі распаўсюджана на 500 рублёў; пры калектыву арганізавана ачэйка Прэч няпісьменнасьці, якая налічвае 50 членаў; праведзен шэраг лекцый і г. д. і г. д.

Было-б добра, калі-б усё так было, як з пачатку, але-ж гэтага няма. У калектыву працуе толькі адзін чалавек, астатнія нічога ня робяць, дзякуючы чаму за ўвесь год адбылося толькі тры пасяджэньні калектыву. Барацьба з браканьерамі не вя зецца. Кепска абстаіць справа з аднаўленьнем паляўнічай гаспадаркі; ніяк калектыў не зьбярэцца скласьці мапу распаўсюджваньня зьвера, ды, наогул кажучы, шмат чаго ня зроблена, а ўсяму гэтаму віной, што працуе адзін чалавек. **К. Г.**

Загранічны агляд



Питомник змей.

В тропиках, как известно, водится много очень ядовитых змей. Укусы некоторых змей причиняют человеку мучительную смерть. В одной только Южной Америке ежегодно подвергаются змеиным укусам до 20.000 человек. Поэтому в Бразилии в 1899 г. основан институт, в котором изготовляется сыворотка—вещество, которое прививается укушенному змеею человеку и спасает его от смерти.

Для получения сыворотки нужен змеиный яд. Он прививается лошади и из ее крови после прививки берется сыворотка.

При институте находится громадный рассадник змей, настоящий „змеиный городок". Для него покупают ежегодно 1000 змей от людей, занимающихся их ловлей.

Чтобы добыть яд, змею придавливают особыми вилами к земле и зажимают ей голову так, что змея сама открывает пасть. Под зубы подставляется особый стеклянный сосудик. Затем надавливают голову на том месте, где у змеи находится ядовитый мешочек. Яд стекает через зубы в мешок Он представляет из себя светлую желтоватую жидкость. Яд высушивается и заключается в стеклянные трубочки. После многократных проверочных испытаний яд готов для прививки лошадям. Сыворотка, добываемая из яда, впрыскивается укушенному человеку. Действие ее длится 10 лет. Результаты таких прививок очень утешительны. Лишь 2—3 проц. укушенных людей умирает, остальные выздоравливают. Таким образом, Бразильский институт, вырабатывающий сыворотку, приносит громадную пользу человечеству.





Змеи греются на солнышке

Змеи, дающие человеку яд, необходимый для противоядия, живут в круглых домиках со всеми удобствами. На крыше домика—отверстие, из которого змея вылезает погреться на солнышке. (*Из немецкой „Рабочей Иллюстр. Газеты"*).

Кролиководство во Франции.

